# Научно-правовое обеспечение социально-экономического и культурного развития Полесского региона в XXI веке

*Материалы научно-практической конференции, посвященной ДНЯМ НАУКИ Пинщины, состоявшейся 20 – 22 июня 2003 г. в г. Пинске*

Минск
Аналитический центр НАН Беларуси
2003

УДК 908 (476. 7) (043. 2)
ББК 26. 89 (4Беи)
Н 34

Редакционная коллегия: **В.К. Бонько, Н.М. Дрозд, И.А. Кибак, Г.Л. Нефагина, Н.Г. Пригодич, С.В. Федорович, Т.П. Юшкевич**

Н 34 Научно-правовое обеспечение социально-экономического и культурного развития Полесского региона в XXI веке: Материалы науч.-практ. конф., посвящ. дням науки Пинщины (Пинск, 20 — 22 июня 2003 г.). — Мн.: Аналит. центр НАН Беларуси, 2003. — 369 с.

ISBN 985-6686-02-4.

Сборник материалов конференции включает приветствия участникам, пленарные и секционные доклады ученых Пинщины. Тематика этих докладов охватывает широкий спектр стратегической программы социально-экономического развития Пинщины и ее реализации в XXI веке.

ISBN 985-6686-02-4

УДК 908 (476. 7) (043. 2)
ББК 26. 89 (4Беи)
© Аналитический центр
НАН Беларуси, 2003

**Г.Ф. Вячорка**

*кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Пінскага філіяла БГЭУ*

## САМААКТУАЛІЗАЦЫЯ НА КАРЫСЦЬ ГРАМАДСТВА

Сёння мы з'яўляемся сведкамі, на першы погляд, парадаксальнага становішча. Нягледзячы на тое, што недапушчальна нізкі статус настаўніка ў нашай дзяржаве істотна не павышаецца, настаўніцкіх публікацый на педагагічныя тэмы становіцца ўсё больш. І прычына гэтага не столькі ў тым, што Рэспубліка Беларусь мае цяпер свае педагагічныя выданні. І не столькі ў тым, што педагагічны друк стаў больш дэмакратычны і даступны для настаўніка. Галоўнае, наша школа, хоць і запаволена, але пераходзіць ад рэжыму функцыявання да стану развіцця. А дакладней, яна шукае сваё нацыянальнае аблічча ў

новых геапалітычных і сацыяльна-эканамічных абставінах.

Думаю, што адным з важнейшых фактараў гэтага працэсу з'яўляецца разняволенне педагагічнай дзейнасці, магчымасць для настаўнікаў праверыць свае ідэі і здагадкі на практыцы, падзяліцца публічна з калегамі сваімі творчымі дасягненнямі, заявіць пра сябе грамадскасці. А гэта – самая высокая патрэбнасць асобы настаўніка, як, зрэшты, і любога іншага чалавека. Пацвярджэннем таму можа служыць Іерархія патрэбнасцей, распрацаваная буйнейшым прадстаўніком так званай гуманістычнай псіхалогіі – грамадзянінам ЗША А.Маслоу. На вяршыні яго Іерархіі (пасля фізічных патрэбнасцей, патрэбнасцей у бяспецы, у прыхільнасці да калектыву, у павазе) стаіць самая высакародная – патрэбнасць у самаактуалізацыі. Самаактуалізацыя – гэта імкнене да самаўдасканалення і самавыяўлення. Асобы, якія самаактылізуюцца, на думку А.Маслоу, адрозніваюцца незалежнасцю, крэатыўнасцю, філасофскім светапоглядам, дэмакратычнасцю ў зносінах, прадуктыўнасцю і г.д. Яны заўсёды выбіраюць рух наперад, пераадоленне перашкод, майстэрства і кампетэнтнасць.

Ажыццяўленню самаактуалізацыі настаўніка праз творчасць безумоўна садзейнічае новае заканадаўства аб адукацыі, мноства новых форм, напрамкаў і ўзроўняў адукацыі, інавацыйная дзейнасць многіх навукова-метадычных цэнтраў і разнастайных навучальных устаноў. Настаўніку часам не хапае толькі аднаго – вопыту падрыхтоўкі назбіранага матэрыялу да публікацыі, смеласці прызнаць свае думкі і перакананні сапраўднымі, якія маюць такое ж права на існаване, як і працы любога навукоўца, журналіста або пісьменніка.

Дапамагчы тут можа не толькі вывучэнне асноў літаратуразнаўства, але і простае знаёмства з рознымі прадмовамі, пасляслоўямі, каментарыямі, крытычнымі заўвагамі да літаратурных твораў. Чытанне дакументальнай, мемуарнай і эпісталярнай літаратуры часта дае магчымасць заглянуць на «кухню» літаратурна-педагагічнай творчасці, зразумець яе тэхналогію.

Нягледзячы на гэта, апублікаваць адразу вынікі сваёй

творчасці пачынаючым аўтарам не заўсёды ўдаецца. Важнае значэнне тут мае вядомасць або знакамітасць, званне або тытул прэтэндэнта. Карацей кажучы, трэба спачатку «зрабіць сабе імя».

Але ж для знакамітасці зусім не абявязкова абараняць дысертацыю, або атрымліваць ганаровае званне. Нам добра вядомы імёны «бястытульных» настаўнікаў і выкладчыкаў – аўтараў арыгінальных, яркіх і глыбокіх па зместу публікацый.

Вядома, тут патрэбен вопыт. Трэба ўлічваць, для каго ты пішаш, каму прапануеш свой твор. Для газеты зайсёды пажаданы матэрыял актуальны, даступны для масавага чытача, захапляючы і нават сенсацыйны. Што ж да часопісаў, то ім больш пасуе навуковы (не блытаць з навуковападобным) або навукова-педагагічны стыль, які спалучае навуковасць з даступнасцю. Калі, напрыклад, у «Настаўніцкай газеце» можа быць надрукаваны артыкул пад назвай «Ад школы памяці – да школы мыслення», то ў навуковым выданні такая вольнасць думкі не дапускаецца. Там патрабуецца вялікая строгасць і поўная дакладнасць, у адпаведнасці з якімі прыведзеная вышэй думка можа быць пададзена так: «Развіццёвае навучанне як дзейсны сродак паляпшэння навучальнага працэсу ў школе і выпрацоўкі ў вучняў творчых здольнасцей» (І.Ф.Харламаў).

У сувязі з гэтым лічу недапушчальнымі прыдзіркі масцітых вучоных да аўтараў навукова-папулярных публікацый за іх нібыта «гіпертрафію» навуковых паняццяў, палажэнняў і г.д. Асаблівасці навукова-папулярнага стылю ў тым і заключаюцца, што ён прадугледжвае выкарыстанне літаратурна-мастацкіх сродкаў: метафар, гіпербал і да т.п.

Успомнім беларускую класіку: «Ой, Лявоніха, Лявоніха мая! Ты пяяла галасней за салаўя... У цябе палова вёскі – кумаўя» або рускае: «Вино лилось рекой». Для вучонага-акадэміста, як у першым, так і ў другім выпадку, гэта яўная дэфармацыя, гіпертрафія, скажэнне ісціны. Для нармальнага ж чалавека – гэта яскравая форма выказвання думкі – гіпербала!

Як сведчыць гісторыя педагогікі, вялікія ідэі і перспектыўна каштоўны педагагічны вопыт часта ўтрымліваюцца не ў чыста навуковых артыкулах, манаграфіях, дысертацыях, а менавіта ў

мастацка-педагагічных творах. Дастаткова назваць раман-трактат Ж.-Ж. Русо «Эміль, або пра выхаванне» і «Педагагічную паэму» А.С. Макаранкі. Інакш і быць не можа, бо педагогіка – гэта не толькі навука або тэхналогія, але і мастацтва.

І наогул, падыходы да педагогікі з тэхналагічнага або мастацкага боку – гэта падыходы, абмежаваныя адпаведнымі канцэпцыямі тых або іншых аўтараў. Апошнім часам у нас стала модным гаварыць і пісаць пра педагагічныя тэхналогіі, хаця яны не заўсёды апраўданы па прычыне іх арыентацыі на рэпрадуктыўнае навучанне, ігнаруюць творчыя магчымасці навучэнцаў і выкладчыкаў. Не настаўнікаў, а менавіта выкладчыкаў! Зразумела, такі падыход мае і свае перавагі: магчымасць паўтарэння навучальнага працэсу любым настаўнікам, аб'ектыўны кантроль ведаў і г.д.

Таму і думаецца, што педагогіка як спецыфічная форма грамадскай свядомасці і чалавечай дзейнасці ў поўным сэнсе гэтага слова існуе толькі ў адзінстве навукова-мастацкага спасцігнення і пераўтварэння педагагічнай рэчаіснасці, дзе вялікае значэнне маюць індывідуальныя якасці педагога, яго духоўнасць, маральнасць, інтэлект, характар.

І падыход да напісання педагагічнага твора спалучае ў сабе інтуітыўныя памкненні разам з тэхналагічнасцю і адпаведнай логікай, планам. Напрыклад, навуковы артыкул на хвалях творчага натхнення можа быць напісаны па наступнаму плану: практычная і тэарэтычная значнасць тэмы; задачы, метады і ход даследавання; аналіз і абагульненне вынікаў; вывады і прапановы.

Цікава, што геніяльны мастак слова М.В.Гогаль, аналізуючы сваю працу над сюжэтам «Мертвых душ», адзначаў: «Я увидел ясно, что больше не могу писать без плана, вполне определённого и ясного, что следует хорошо объяснить прежде самому себе цель сочинения своего, его существенную полезность и необходимость, вследствие чего сам автор возгорелся бы любовью истинной и сильной к труду своему, которая животворит всё и без которой нейдёт работа...(«Авторская исповедь»).

Першапачаткова артыкул заўсёды падобны на «балванку», якую трэба абтачыць, абфасаваць, адшліфаваць. Ён павінен

таксама добра адляжацца. І калі за гэты час узнікнуць сумненні адносна асобных месц, іх трэба рашуча выдаляць. Таму што ўсякая публікацыя на педагагічную тэму звязана не толькі з грамадзянскай ініцыятывай, але і з высокай адказнасцю перад грамадствам.

З другога боку, калі мы будзем імкнуцца да абсалютнай дасканаласці, то артыкул не будзе напісаны ніколі. Вось чаму ў бездакорным для пабочных людзей творы сумленны аўтар заўсёды ўбачыць свае недахопы.

Бывае калегі пытаюць: «Над чым зараз працуеш?». Прыходзіцца адказваць, што над некалькімі артыкуламі адначасова. Што гэта падобна на вырошчванне памідораў. Які з іх раней паспявае, той і зрываеш. Некаторым, праўда, прыходзіцца даспяваць на падаконні. Астатнім, на жаль, папасці на стол так і не давядзецца.

Калі лепш пісаць? Безумоўна, жаваранкам» лепш пісаць у першай палове дня. Калі ж вы «сава», то больш прадуктыўным будзе вячэрні час. Як шуткуе М.Жванецкі: «Писать, как и писать, – нужно тогда, когда терпеть больше невозможно».

Адным лепш пішацца ў чыста прыбраным памяшканні, дзе ўсё ўпарадкавана і нішто не можа адцягнуць увагі. Другім больш падыходзіць «рабочы беспарадак», прысутнасць гукавога фону і г.д.

Калі адны пішуць проста і адкрыта, то другія напышліва або мудрагеліста, часта ўжываючы замест «я» займеннік «мы». А хто хаваецца за гэтым «мы», дакладна не ведае не толькі чытач, а, бадай, і сам аўтар. Хутчэй за ўсё гэта маска або грым, пад якім маладыя акцёры хаваюць сваю прафесійную недасканаласць. Толькі з прыходам вопыту і майстэрства акцёр знімае з сябе маску і іграе адкрыта, спадзеючыся выключна на свае асабістыя сілы.

Майстры педагагічнай працы добра ведаюць, што абстрактна-лагічныя або тэарэтычныя выклады (звароты) у асноўным уздзейнічаюць на свядомасць выхаванцаў і садзейнічаюць фарміраванню іх перакананняў. А трапныя прыклады і яркія вобразы ўплываюць на больш глыбокія пласты

псіхікі праз унушэнне. Гэтаксама і ў артыкулах. Прычым артыкулы значна выйграюць, калі адлюстроўваюць асабісты вопыт аўтара, у тым ліку і неафіцыйны бок яго жыцця. Гэта заўсёды падкупляе чытача, выклікае павышаную цікавасць (спрацоўвае эфект «падглядвання ў замочную дзірку»). Але тут вельмі важна захаваць пачуццё меры. Каб занадта доўгія і шчырыя выказванні не ператвараліся ў душэўны стрыптыз, а ператрэсванне асабістых рэчаў не выклікала чхання. Бо, як гаварыў адзін акцер, пры такім «самараспрананні» губляецца, знікае тайна або магія ўздзеяння выступаючага на публіку.

А цяпер пра мову напісання. Як мне здаецца, пісаць на беларускай мове ў нашых выданнях павінны нават тыя беларусы, якія дасканала ёю не валодаюць. Ад гэтага выйграе не толькі грамадска-педагагічны імідж аўтара, але і змест яго публікацый. Справа ў тым, што ў працессе перакладу з рускай мовы на беларускую кожная думка або выраз, паняцце або слова яшчэ раз прашчупваецца з усіх бакоў і паўстае больш поўна, дакладна і ўражліва. І тады, напрыклад, пад тэрмінам « трудолюбие» мы будзем разумець не «працалюбства» (што вельмі часта можна сустрэць у нашым друку), а менавіта «працавітасць» – чыста беларускае слова, якое больш трапна адлюстроўвае змест паняцця. Тады і словам «нядзеля» (не рабі, не працуй) мы будзем называць толькі адзін дзень на тыдні, а не ўвесь тыдзень, як гэта прынята на рускай мове.

Разам з тым лічу, што цытаты рускіх аўтараў трэба даваць арыгінальнымі. Няма для нас ніякай патрэбы перакладаць іх на беларускую мову. Такія пераклады часта прыводзяць толькі да скажэння думак і непаўторных вобразаў. Аргументы ж накшталт таго, што калі ў арыгінале мы будзем даваць рускіх аўтараў, то павінны гэтаксама даваць і нямецкіх, і ангельскіх, і іншых – беспадстаўныя. І менавіта таму, што ў нашай краіне заканадаўча замацаваны дзяржаўнымі толькі дзве мовы – беларуская і руская. Тыя, на якіх наш народ можа мець больш або менш лёгкія ўзаеміны. З гэтага і патрэбна зыходзіць пры напісанні артыкулаў на беларускай мове. Тым самым будзе не толькі праяўлена павага да абедзвюх роднасных культур, але і да існуючых у нашай дзяржаве законаў.

Што да афармлення рукапісаў, то рэдакцыя кожнага выдання прад'яўляе да іх свае патрабаванні. І гэта таксама трэба ўлічваць, каб не было лішніх непаразуменняў і затрымак. У адпаведнасці з законам аб друку нашы газеты і часопісы сёння настойліва падкрэсліваюць, што думкі аўтараў могуць не супадаць з меркаваннямі іх рэдакцый, што аўтары самі нясуць адказнасць за дакладнасць інфармацыі, якая ўтрымліваецца ў публікацыях.

Усё гэта дае падставу спадзявацца, што творчыя дасягненні нашых педагогаў не загінуць. Увесь багаты ўраджай педагагічнай нівы стане набыткам нацыянальнай сістэмы адукацыі, дзяржавы і грамадства.

# СОДЕРЖАНИЕ

Вступительное слово Председателя оргкомитета
**И. А. Кибака**........3

## ПРИВЕТСТВИЯ

**Г.Н. Невыглас** – Государственный секретарь Совета Безопасности Республики Беларусь........5
**П.Г. Никитенко** – академик-секретарь Отделения гуманитарных наук и искусств НАН Беларуси........6
**П.И. Бригадин** – Министр образования Республики Беларусь........9
**В.В. Шуст** – Председатель Пинского горисполкома........10
**В.В. Сашко** – Председатель Пинского райисполкома........11

## ПЛЕНАРНЫЕ ДОКЛАДЫ

**М.А. Бяспалая.** Земская Пінщчына........14
**В.В. Василевицкий.** Психологический портрет ученого глазами старшеклассников г. Пинска........17
**Н.П. Денисюк.** Развитие человеческого потенциала в Республике Беларусь........23
**Т.Т. Кузнецова.** Проблемные регионы: специфика и перспективы развития........29
**П.С. Лопух.** Проблемы освоения природно-ресурсного потенциала водоемов Пинского Полесья........35
**Н.Р. Прыгодзіч.** З лексікі роднай гаворкі вёскі Лышча........43

## СЕКЦИЯ 1
### (техника, экология, медицина)

**А.И. Бобровник.** Основные направления развития конструкций тракторов «Беларус»........52
**В.Г. Вакульчик.** Прогнозирование инфекционных осложнений после аппендэктомии у детей........57
**А.Ф. Веренич.** Динамика ботанического состава, продуктивности и качества корма агроценоза лугов длительного использования........61
**А.А. Волчек, Л.Н. Усачева.** Анализ современного состояния земельных ресурсов Пинского района........73
**А.П. Волынец, П.К. Кинтя. Р.А. Прохорчик, Л.А. Пшеничная, Г.В. Морозик, Н.Е. Манжелесова.** Стероидные соединения как стимуляторы роста клевера........77
**В.Ф. Галковский, С.А. Пекун.** Результаты научных исследований в зоне Полесья за 30-летний период........80

**А.П. Германович.** Ветроэлектрические установки малой мощности.....86
**А.А. Гордич.** Идентификация динамических систем итерационным методом сглаживания.....89
**О.Н. Жук.** Фактор роста нервов и химические токсиканты свинец и аммоний: влияние на некоторые поведенческие реакции и структурные характеристики нервной системы крыс.....93
**О.Л. Канделинская, Т.Я. Пелагейчик, Е.Р. Грищенко, Е.А. Колосова.** Люпин узколистный: рострегулирующее и адаптогенное действие 24-эпибрассинолида.....101
**Н.В. Кислов.** О некоторых задачах экологического нормирования.....102
**Ю.М. Корчоха**. Составляющие водного баланса мелиорированных речных водосборов.....110
**Н.Я. Кузьменкова, Н.А. Бобровский, Е.А. Жинжин.** Экологические особенности и экономическая эффективность использования гидроморфных почв на мелиоративном объекте.....119
**В.М. Ливенский.** Радиоэкологическая и социально-экономическая реабилитация загрязненных радионуклидами районов путем развития инвестиционных процессов.....126
**О.Ф. Макаревич, Н.И. Овсяник, Н.А. Слижевский.** Лапаротомия с интубацией кишечника в комплексном лечении общего перитонита.....130
**А.И. Медведский, Н.А. Бобровский.** Эколого-агрономическое обоснование строительства польдерных систем в условиях Белорусского Полесья.....132
**А.И. Митрахович, В.Т. Климков, В.А. Немиро.** Проблема чистой воды в сельской местности Республики Беларусь.....136
**Е.М. Мишук. А.В. Семенченко.** Формирование злаковых травостоев долголетнего использования на осушенных торфяно-болотных почвах Белорусского Полесья.....144
**К.А. Найденова, Н.А. Бобровский.** Влияние минеральных удобрений и уровней грунтовых вод на содержание азотистых соединений в злаковых травах, возделываемых на торфяных почвах.....149
**А.П. Русецкий.** Польдерные системы с регулируемой длительностью затопления.....154
**И.Р. Струк.** Эффективность пойменного лугового кормопроизводства.....157
**А.С. Судас, В.М. Ливенский.** Перспективная специализация сельскохозяйственного производства в радиационно-загрязненных районах Пинского Полесья.....164

**Г.Л. Нефагина.** Литература белорусской эмиграции..........................311
**А.Ф. Рябов.** Постсоветская Беларусь: концепции развития....................317
**Т.В. Сорокина.** Реформирование бюджетного процесса Республики Беларусь в переходной экономике..........................................................324
**О.И. Тесленок.** К вопросу об устойчивом развитии Полесского региона.................................................................................................330
**В.С. Филипенко, Е. В. Филипенко.** Внешнее воздействие на эффективность природопользования..................................................337
**В.В. Шапялевіч.** Песні пра Дунай у палескім фальклоры.....................344
**О.Н. Шарая.** Обряд Куст в Пинском Полесье: аксиология, символика и трансформация....................................................................................350
**Г.І. Шаўчэнка.** Навошта адраджаць класічную адукацыю?...................358
**М. І. Яніцкі.** «Пінская шляхта»: прыярытэт асветніцкіх ідэй.................361